# ПАЛЕССЕ І ПАЛЕШУКІ Ў ПАЭЗІІ УЛАДЗІСЛАВА СЫРАКОМЛІ

**Г. А. Леонцьеў**

*glebleo3@gmail.com;*
*Навуковы кіраўнік — Л. А. Гедзімін, кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

На аснове паэтычных твораў Уладзіслава Сыракомлі быў прааналіваны вобраз Палесся і палешукоў у ягонай творчай спадчыне. Высветлена, якім бачыў паэт палешука, як характарызаваў Палессе. Раскрытая шматграннасць паэзіі пісьменніка, які ствараў вобраз не толькі ўсёй Беларусі (Літвы), але і канкрэтнага рэгіёна, Палесся.

***Ключавыя словы:*** беларуская літаратура; Уладзіслаў Сыракомля; Палессе.

Уладзіслаў Сыракомля нарадзіўся ў вёсцы Смольгаве Бабруйскага павета Мінскай губерні (сёння Любанскі раён Мінскай вобласці). Факт нараджэння на палескай зямлі адбіўся і ў творчасці паэта.

У паэзіі Сыракомлі мы можам вылучыць тры «палескія паэмы», а менавіта: «Хадыка» (1851), «Дабрародны Ян Дубарог» (1854) і «Улас» (1857). Палеская тэма таксама раскрытая ў лірычным вершы «З уражанняў з падарожжа па Палессі» (1850) і невялічкай п’есе «Марка» (1859).

У творах «Марцін Студзенскі» і «Памяці Фабіяна Ацэрна» пісьменнік таксама прыгадвае Палессе, але яно не займае такога важнага месца ў іх, як у раней згаданых творах. У паэме «Марцін Студзенскі» У. Сыракомля аддзяляе Палессе як ад Літоўскай Русі, так і ад Украіны: «*Адна частка ў цэнтр Літоўскай Русі, / Пад старую Мінска пайшла крэпасць, / Другая ў Палессі гаспадарыць мусіць, / Да крэпасці слуцкай нясецца імклівa*» (Тут і далей пераклад наш – *Г. Л.*) [1, IV, с. 109].

Тым не менш, як відаць з астатніх твораў пісьменніка, Палессе для яго адзін з рэгіёнаў Літвы. Напрыклад, у вершы «Памяці Фабіяна Ацэрна» паэт пералічвае, што дзеіцца ў розных частках Літвы (Навагрудчына, Жамойць), пішучы ў тым ліку і пра Палессе. Творца адзначае лясістасць мясцовасці, дзе шмат добрага дрэва на вялікія караблі: «*У палескай пушчы, цёмнай і бяздоннай, / Расце сасніна і дуб стаплечны; Можна рабіць з іх высокую будову / Мачтаў караблёў*» [1, VII, с. 222]. Пра добрую якасць беларускага лесу для караблёў пісаў яшчэ М. Гусоўскі ў «Песні пра зубра» (1514). У. Сыракомля ж ужо вылучае канкрэтна Палессе, імаверна, як найбольш лясісты рэгіён Беларусі.

Прыгажосць гушчароў Палесся паэт і апявае ва ўступе да паэмы «Улас». Пісьменнік пачынае твор словамі «*Сумны краю Палесся!*»

[1, III, с. 252], пераймаючы зварот А. Міцкевіча да Літвы з «Пана Тадэвуша». Такім чынам, Палессе паўстае перад вясковым лірнікам як прыгожы, але адначасова і меланхалічны край лясоў і балот, дзе У. Сыракомлю зачароўвае ягоная простасць, нават звычайны жоўты пясок і саламяныя стрэхі хат і цэркваў.

Зачараваны вясковы лірнік і тутэйшым народам. Паэт прасякнуты любоўю да ўсёй мясцовай культуры, якую, на яго думку, нічога не магло знішчыць. Прычым, паводле творцы, менавіта палешукі захавалі найбольш славянскі выгляд: «*Ніякі новы звычай, ніякая свежая ідэя, / Не зменіць ні іх мовы, ні кшталтаў адзежы; / Ніякі новы дух веку не прыклаў рукі, / Каб змяніць біццё сэрца або такту песенкі. / Як вякамі насілі славянскія народы, / Такія носяць сукманыя, такія ж бароды…*» [1, III, с. 253].

Разумее творца і цяжкасці палешукоў. Наўпрост адзначае, што з ходам часу «*нічога тут не прыбавілася, акрамя хіба беднаты*» [1, III, с. 253], і піша пра гора і нядолю вайны, ад якой не раз цярпела Палессе: «*Сумна ў палескіх дварах і па вёсках кметаў: / Там штодзень збройны жаўнер бяскарна наляціць, / Пакрыўдзіць сівую галаву, стадолу запаліць, / Пазбірае здабычу і паляціць далей*» [1, III, с. 261].

Аднак У. Сыракомля адзначае таксама і гатоўнасць палешукоў бараніць сябе: «*Каго мацней, ганебней казачы бізун даткнецца, / Той ішоў у лес са стрэльбай вынішчаць іх сотні*» [1, III, с. 262].

У паэме «Хадыка» вясковы лірнік упершыню для сябе стварае вобраз палешука («*Звалі мяне Хадыка, родам з Палесся*» [1, I, с. 33]). Хадыка ў паэме атрымлівае наступныя характарыстыкі:

1. Прывязаны да сваёй малой радзімы («*Божа мой! Як тую хатку пабачыць мне хочацца!*» [1, I, с. 34]).

2. Фізічна моцны («*Дзе не раз мне прыходзілася барукацца з мядзведзем*» [1, I, с. 34], «*Я быў сільны, як мядзведзь, а хуткі, як дзіця*» [1, I, с. 34]).

3. Паляўнічы («*А ахвочы да ловаў! – ані дня, ані ночы. / Гэй, дарага ж заплаціў я за лавецкую ахвоту!*» [1, I, с. 34]).

4. Любіць выпіць («*Вось раскажу шчырую праўду, быццам на споведзі: / Тры дні я піў гарэлку. Прайшоў дзень указаны*» [1, I, с. 35]).

5. Пакутнік («*Тут пакуль лоўчы, карыстаючыся часам, / загадаў мяне схапіць, прывязаць да дрэва, – / Білі мяне бізунамі. / Дарма чалавек крывёй абліваўся, дарэмнаў млее, / Дарэмна стары бацька па зямлі валочыцца, / Дарэмна жонка плача... Ах! той працяжны стогн / Панурае лясное рэха чуе і паўтарае! / Але лоўчы не чуў – так быў гневам раз'юшаны*» [1, I, с. 36], «*Я працаваў слязьмі, еў хлеб горычы*» [1, I, с. 37], «*Я змагаўся з голадам, холадам, сумленнем і чортам*» [1, I, с. 40]).

6. Добра ведае лес («*Я бег ноччу і лесам як па поўнай дарозе*» [1, I, с. 37]).

7. Сумленны («*Бо дробязь людскія суды – там у грудзях глыбока / Горшы суд... дзе сумленне ўладу мела!*» [1, I, с. 37], «*Не засну, бо мне сэрца страшна дрыжала»* [1, I, с. 38], *«А ў мяне ў сэрцы пажар над усе пажары!*» [1, I, с. 39]).

Амаль ідэнтычныя характарыстыкі мае вобраз палешука з паэмы «Улас»:

1. Фізічна моцны («*<u>Моцныя</u> плечы падзёртая сярмяга хавае*» [1, III, с. 255]).

2. Бедны («*Моцныя плечы <u>падзёртая сярмяга</u> хавае*» [1, III, с. 255]).

3. Паляўнічы («*Каля пояса паляўнічы нож і малая каліта*» [1, III, с. 255], «*І заяц сёння забіты ў лесе на перашыйку*» [1, III, с. 256]).

4. Добра ведае лес («*Дзякуй Богу, я ведаю пушчу*» [1, III, с. 258]).

5. Клапатлівы («*Ён штодзень да шляхецкіх сем'яў наведваецца, / Штодзень наведвае пана ў Чортавым востраве*» [1, III, с. 265]).

6. Смелы («*Не баяўся няволі або жыцця страты*» [1, III, с. 274]).

7. Пакутнік («*Скруціўся, шыпеў з болю, прайшлі па ім дрыжыкі*» [1, III, с. 287]).

8. Верны (герой адмаўляецца выдаць шляхту, якую шукаюць казакі).

У паэме «Дабрародны Ян Дубарог» сустракаецца эпізадычны персанаж Грыцько сын Кірылы, які, як і папярэднія героі-палешукі, з'яўляецца фізічна моцным паляўнічым, а таксама рашучым і смелым. У частцы з гэтым персанажам У. Сыракомля ўжо акцэнтаваў увагу на тым, што палешукі выдатна плаваюць: «*Пан не плаваў, бо туша яму не давала; / А паляшук, як рыба, так чуецца ўдала, / Стральцы выплылі хутка супольна і самі, / Топчуць хвалі нагамі і б'юць іх рукамі...*» [1, I, с. 83].

Але Грыцько сын Кірылы, хоць і быў узнагароджаны валокай урадлівай зямлі, пакарання і адпаведна пакутніцтва не пазбег: «*А што трымаў за чуб мой хамскаю далонню, / Хай вылічаць сто розгаў, паводле закону. – / Так Грыцько сын Кірылы цярпеў пакаранне, / А мы, шляхта, стуль маем навек павучанне…*» [1, I, с. 84].

Малавядомая сёння п'еса «Марка» з падзагалоўкам «урывак» змяшчае ў сабе абразок з жыцця палешукоў. Першапачаткова гэта павінна была быць сцэнічная адаптацыя «Уласа», аднак паэт не захацеў працягваць пачатае. П'есу адкрывае маналог дзяўчыны, у якім гаворыцца, што яе кахае Пракоп, але гэтае пачуццё не ўзаемнае. Пасля заходзіць яе бацька, паляўнічы, наракае на ваенныя дзеянні, заўважаючы: «*Хо! хо! Паляшук з Волі Божай / Мае дзе схавацца, быццам мыш у нары. / Ад чаго ж лясы, чароты, балоты*?» [1, V, с. 304].

Паводле героя твора, лясы і балоты – гэта тое, што ратуе палешука. Далей на сцэне з'яўляецца Пракоп з навіной, што хутка ў хату зойдзе сам князь Радзівіл з канфедэратамі, а таксама гаворыць, што хоча Аксану ўзяць за жонку. Сканчаецца твор уваходам Радзівіла ў хату.

У 1850 г., едучы да Ю. Крашэўскага, У. Сыракомля напісаў верш «З уражанняў з падарожжа па Палессі», дзе адлюстраваў усю бачаную ім нядолю палешукоў. Толькі ў гэтым вершы на палескую тэму з'явіліся павер'і сялян (буслянка – да шчасця). Паэт апісвае цяжкія ўмовы жыцця простага народа: «*Але калі боль дапячэ, / Так і перад Богам чалавек блюзніць, / Сляза прагрызае павекі, / З працы косці аж баляць…*» [1, VI, с. 225].

Такім чынам, палешукі ў паэзіі Сыракомлі прадстаўляюцца як фізічна моцныя людзі, якія прафесійна займаюцца паляваннем і цудоўна арыентуюцца ў лесе. Амаль усе героі-палешукі (выключэнне – дзейныя асобы з п'есы «Марка») цярпелі за нешта, часта за вернасць і выкананне свайго абавязку.

Палессе для У. Сыракомлі – гэта любімы, але сумны край. Апяванне палескага краю лірнікам вясковым мае меланхалічны характар. Паэт прызнае, што тутэйшы народ жыве крайне бедна, але знаходзіць і ў гэтым для сябе нешта сумна-прыгожае. Творца зачароўваецца культурай, якую захавалі палешукі, атаясамляе яе са старажытнай культурай усіх славян.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1.*Syrokomla Wł.* Poezye Ludwika Kondratowicza (Władysława Syrokomli): w 10 t. / Wł. Syrokomla, W. Korotyński. Warszawa: Skład główny u Gubetnhnera i Wolffa, 1872. T. I–X.